ГА “Беларуская асацыяцыя журналістаў”

**Асвятленне парламенцкіх выбараў 2008 г. у беларускіх СМІ**
**Выніковы даклад**

*(21 ліпеня – 12 кастрычніка 2008 г.)*

## Уводзіны

Мінск, 15 кастрычніка 2008 г.

ГА “Беларуская асацыяцыя журналістаў” – незалежная беларуская грамадская арганізацыя, адданая прынцыпам свабоды слова і СМІ, – праводзіла маніторынг асвятлення ў беларускіх медыя парламенцкіх выбараў, што адбыліся 28 верасня 2008 г. Мэтай маніторынгу было вызначыць, наколькі поўна, аб’ектыўна і збалансавана беларускія СМІ асвятлялі дзейнасць кандыдатаў і іх выбарчыя праграмы. Мы не мелі на мэце падтрымаць таго ці іншага кандыдата або палітычную партыю, а імкнуліся звярнуць увагу журналісцкай супольнасці краіны на праблему адэкватнага адлюстравання выбарчай кампаніі.

Гэты даклад падсумоўвае вынікі маніторынгу, які ладзіўся з 21 ліпеня па 26 верасня 2008 г., а таксама падае кароткі агляд ацэнак галасавання і ўсёй выбарчай кампаніі, што з’явілся ў беларускіх СМІ пасля аб’яўлення афіцыйных вынікаў галасавання.

Аб’ектамі маніторынгу БАЖ былі 4 агульнанацыянальныя і рэгіянальныя тэлеканалы, 3 радыёстанцыі, 9 газет і 4 інтэрнет-выданні.[1] Аналіз праграм навін рабіўся на падставе часу, які адводзіўся прэтэндэнтам, а таксама прэзідэнту, ураду ды іншым суб’ектам і структурам (усяго 35 суб’ектаў), што мелі дачыненне да выбараў. Ацэньваўся таксама характар асвятлення. Сумарны час, які адводзіўся суб’ектам маніторынгу, вызначаўся метадам колькаснага аналізу. Для ацэнкі характару рэпрэзентацыі (станоўчага, нейтральнага ці адмоўнага) выкарыстоўваўся метад якаснага аналізу.

## Асноўныя вынікі

Цягам усяго перыяду маніторынгу дзяржаўныя агульнанацыянальныя і рэгіянальныя электронныя і друкаваныя СМІ не надавалі выбарчай кампаніі значнай увагі. Амаль увесь час большасць гэтых СМІ падавала выбарчую тэматыку ў сваёй традыцыйнай манеры, г. зн. адводзячы ёй менш часу і плошчы, чым спорту і прагнозу надвор’я. Таму названыя СМІ не здолелі стварыць шырокую панараму выбараў і рэпрэзентаваць усіх суб’ектаў, што мелі да іх дачыненне. Як правіла, яны засяроджваліся на 5-6 суб’ектах, пры гэтым большасць часу і плошчы, параўнальна з астатнімі суб’ектамі, адводзілі прэзідэнту і ЦВК.

Дзяржаўныя СМІ не арганізавалі палітычных дэбатаў паміж кандыдатамі ў дэпутаты, не асвятлялі праграм тых палітычных партый, што бралі ўдзел у выбарах. Замест гэтага

[1] Аналіз БАЖ ахопліваў 20 сродкаў масавай інфармацыі, а менавіта: тэлевізійныя і радыёпраграмы *«Наши новости» (ОНТ), «Панорама недели» (Першы нацыянальны канал БТ), «Навіны рэгіёна»* (Гомель), *«Новости-Регион» (ТРК «Магілёў»), «Радыёфакт» (Першы нацыянальны канал Беларускага радыё), «Навіны» (Гомельскае абласное радыё 101.3FM), “Навіны” (абласное радыё ТРК “Магілёў"),* газеты *“Советская Белоруссия: Беларусь сегодня”, “Рэспубліка”, “Белорусы и рынок”, “Народная воля”, “Комсомольская правда” в Белоруссии”; “Брестский курьер”, “Гомельская праўда”, “Могилёвская правда”, “Днепровская Неделя”,* інтэрнэт-выданні www.belta.by, www.naviny.by, www.tut.by і інтэрнэт-версію “Еўрапейскага радыё для Беларусі” www.euroradio.fm.

асноўную ўвагу яны скіравалі на арганізацыйна-тэхнічныя аспекты выбарчай кампаніі, падкрэсліваючы пры гэтым вызначальную ролю ЦВК і мясцовых органаў улады. Больш за тое - нават адмыслова прысвечаныя выбарам праграмы тэлебачання не звярталі ўвагу гледачоў на тое, што галоўны сэнс выбарчай кампаніі – у знаёмстве з палітычнымі праграмамі прэтэндэнтаў на парламенцкі мандат, іх палітычнымі платформамі і канкурэнтнымі сцэнарамі развіцця беларускага грамадства, паміж якімі грамадзяне маюць зрабіць выбар.

Дзяржаўныя СМІ адвялі прэзідэнту і ЦВК не толькі большасць часу і плошчы, але і асвятлялі іх дзейнасць пераважна станоўча.

Праігнараваўшы шмат якіх суб’ектаў выбарчага працэсу, дзяржаўныя СМІ не забыліся, аднак, на тое, каб паказаць апазіцыю ў адмоўным святле. Асабліва выразна гэта было бачна падчас апошняга этапу агітацыйнай кампаніі. Разам з тым, трэба адзначыць, што прапагандысцкая крытыка апазіцыі была нашмат менш інтэнсіўнай, калі параўнаць сёлетнюю кампанію з парламенцкімі выбарамі 2004 г. і прэзідэнцкімі выбарамі 2006 г.

Што датычыць назіральнікаў, то да іх дзяржаўныя СМІ ставіліся па-рознаму: пераважна станоўча асвятлялі працу назіральнікаў з СНД і крытыкавалі або рэпрэзентавалі ў нейтральнай манеры заходніх назіральнікаў. А беларускіх назіральнікаў названыя медыя практычна не заўважылі.

Нягледзячы на тое, што кандыдаты мелі магчымасць наўпрост звярнуцца да выбарцаў праз дзяржаўныя СМІ, гэта не змяніла агульнага характару выбарчай кампаніі, бо іх выступы трансляваліся ў неспрыяльны час. Пазней ЦВК вырашыла паўтарыць іх у запісе, аднак эфектыўнасць і гэтай трансляцыі застаецца пад пытаннем: яны з’явіліся на канале з не самым высокім рэйтынгам.

Такім чынам, маргіналізаваўшы асноўных суб’ектаў выбарчай кампаніі – кандыдатаў у дэпутаты і палітычныя партыі, – дзяржаўныя СМІ праз гэткае асвятленне выбараў фактычна звялі да мінімуму палітычную канкурэнцыю і практычна выключылі з палітычнай барацьбы выбарцаў.

Адрозна ад дзяржаўных СМІ, незалежная прэса і інтэрнэт-выданні падавалі значна шырэйшую карціну выбарчай кампаніі. Аднак абмежаванасць накладу і невялікі ахоп аўдыторый не дазволіў гэтым СМІ ані ажывіць палітычную сітуацыю ў краіне, ані тым больш змяніць характар выбарчай кампаніі.

**Канкрэтныя вынікі маніторынгу**

Выкладзеныя ніжэй канкрэтныя вынікі маніторынгу аргументуюць пададзеныя вышэй ацэнкі і служаць падставай для высноваў у заключнай частцы нашага дакладу.

Як відаць з выніковых графікаў (гл., напрыклад, графік праграмы навін *«Наши новости» нацыянальнага тэлеканалу ОНТ*), дзяржаўныя электронныя і друкаваныя СМІ не надавалі асвятленню выбарчай кампаніі істотнай увагі. Досыць часта выбарчай тэматыцы адводзілася амаль столькі ж ці нават менш часу і плошчы, як спорту або надвор’ю.

Асабліва яскрава гэтая тэндэнцыя выявілася на пачатковым этапе маніторынгу. Напрыклад, у перыяд з 1-га па 15-га жніўня Гомельскае абласное радыё 101.3 FM адвяло выбарчай тэматыцы часу ў 12 разоў менш, чым прагнозу надвор’я. Іншая рэгіянальная праграма *«Новости-Регион» (ТРК «Магілёў»)* прысвяціла выбарам усяго некалькі секунд. А дзяржаўныя абласныя газеты *“Гомельская праўда”*, *“Могилёвская*

*правда”* і *“Днепровская неделя”* ў гэты ж перыд практычна не згадвалі выбарчую тэматыку.

Вельмі паказальным з’яўляецца і тое, як асвятляла выбарчы працэс галоўная штодзённая газета краіны *“Советская Белоруссия”*. Параўнальна з недзяржаўнай газетай *“Народная воля”* яна адвяла выбарчай тэматыцы плошчы ў дзесяць разоў менш. Такі мінімалісцкі падыход быў характэрны і для ўсіх астатніх дзяржаўных СМІ, якіх заканадаўча не абавязвалі друкаваць ці
трансляваць звароты кандыдатаў.

Дзяржаўныя СМІ або цалкам праігнаравалі шмат якіх суб’ектаў выбарчага працэсу, або надавалі ім мінімум увагі. Выключэннямі з гэтага правіла былі толькі прэзідэнт і ЦВК: супольны аб’ём прысвечаных ім часу і плошчы вар’яваўся ў залежнасці ад сродку масавай інфармацыі ад 60% да 92% (гл. выніковыя графікі праграмы *«Радыёфакт» (Першы нацыянальны канал Беларускага радыё),* www.belta.by, *праграмы «Наши новости» (ОНТ),* а таксама газет *“Рэспубліка”* і *“Советская Белоруссия”*). Іншым двум суб’ектам – назіральнікам ад СНД і заходнім назіральнікам – было адведзена нашмат менш часу і плошчы: ад 0,5% у газеце *“Советская Белоруссия”* да 16% у праграме *“Радыёфакт”*. Асобныя згадкі пра яшчэ двух суб’ектаў – мясцовыя ўлады і праўрадавыя арганізацыі – ніякім чынам не ўзбагацілі надзвычай спрошчанай карціны выбарчага працэсу. Акрамя вышэйпералічаных, у вядучых дзяржаўных электронных і друкаваных СМІ фактычна не фігураваў ніхто з астатніх 35-і суб’ектаў маніторынгу. У пэўным сэнсе выключэнне склаў дзяржаўны інтэрнет-рэсурс www.belta.by. Ён, аднак, хоць і надаваў увагу большай колькасці палітычных суб’ектаў, але не пазбег агульнай для дзяржаўных СМІ тэндэнцыі – выдзеліў 77% сваёй віртуальнай плошчы прэзідэнту і ЦВК.

Такім чынам, па-за абавязкам трансляваць ці друкаваць звароты кандыдатаў, які мелі некаторыя дзяржаўныя СМІ, яны мала што зрабілі, каб паставіць тэму выбараў, а таксама розныя палітычныя праграмы і погляды кандыдатаў, у цэнтр грамадскай увагі.

Палітычныя праграмы і платформы не разглядаліся нават у тэлеперадачах, адмыслова прысвечаных выбарам. Так, рэгулярная 30-хвілінная передача *“От выборов до выборов” (тэлеканал “Лад”, ТРК г. Гомель),* па сутнасці, не тычылася выбараў. У перадачы (ад 26 жніўня 2008 г.), прысвечанай Лоеўскаму раёну, вядучая ў прамым эфіры паведамляла: *“Включите громче динамики, жители Лоевского района… Вы увидите знакомые лица, улицы и дома – о вас, о вашей жизни сегодня в нашей программе. Если вы ещё не всё знаете о соседях, коллегах по работе, сейчас вы много о них узнаете”*. Пра выбары нагадваў толькі ролік *“От выборов до выборов”* (на пачатку, у сярэдзіне і напрыканцы праграмы). Вось яго тэкст: *“От выборов до выборов. Четыре года созидательного труда. Рост благосостояния населения. Уверенный курс в будущее. Районы Гомельщины подводят итоги в утреннем эфире телеканала “Лад”*. Такім чынам, праграма пераключала ўвагу тэлегледачоў з праблемы выбару паміж рознымі палітычнымі і сацыяльнымі перспектывамі на “мирный созидательный труд”, не прэзентуючы пры гэтым ніякіх альтэрнатыўных поглядаў і меркаванняў.

Акрамя агульнага, залішне спрошчанага, мінімалісцкага падыходу да асвятлення выбараў, дзяржаўныя СМІ салідарызаваліся ў сваіх станоўчых ці адмоўных ацэнках тых або іншых палітычных суб’ектаў. Гэтак, прэзідэнт і ЦВК заўсёды ацэньваліся станоўча ці вельмі станоўча. А апазіцыя калі і згадвалася, дык пераважна ў адмоўным кантэксце. Дзейнасць назіральнікаў атрымлівала станоўчую ці адмоўную ацэнку ў залежнасці ад таго, былі гэта назіральнікі ад СНД або ад Еўрасаюзу.

Вось некалькі прыкладаў. Артыкул *“Начните “демократию” с себя”* (*“Гомельская праўда”, 04.09.2008)* утрымлівае наступную выснову адносна заходніх назіральнікаў: *“Так что все замечания и предложения, сделанные в отчётах БДИПЧ ОБСЕ, – лишь очередной политический заказ по дискредитации нашего действующего избирательного законодательства. И объективного мониторинга нынешней важной для страны и нас, белорусских граждан, политической кампании ждать не приходится. До тех пор, пока ангажированные эксперты не прекратят использовать удобные для них двойные стандарты”.*

А вось дзейнасць назіральнікаў ад СНД дзяржаўныя СМІ без ваганняў ацэньвалі пазітыўна (гл., напрыклад, графікі праграмы *“Наши новости” (ОНТ)* і праграмы *абласнога радыё ТРК “Магілёў”*). Тыя, у сваю чаргу, пазітыўна ацанілі дзейнасць ЦВК і мясцовых уладаў па арганізацыі выбараў. Як заявіў С. Лебедзеў, кіраўнік місіі назіральнікаў СНД, *“то, что мы сейчас видели, говорит о том, что местные власти и руководители избирательных комиссий ответственно подходят к избирательному процессу, делают всё необходимое, чтобы выборы были демократичные, чтобы были учтены все пожелания наблюдателей и чтобы были соблюдены права избирателей”* (http://news.tut.by.politics/115729.html).

Затое дзейнасць апазіцыі трактавалася пераважна як неадэкватная і неадпаведная чаканням выбарцаў. Напрыклад, дзяржаўны інтэрнет-рэсурс БЕЛТА (www.belta.by) адмоўна ацаніў ролю апазіцыйных партый. Паводле слоў сакратара ЦВК Мікалая Лазавіка, ім, знямоканым унутрыпартыйнай барацьбой *“не остаётся сил, чтобы заниматься социально-экономическими вопросами, которые должны быть в основе политики и которые волнуют избирателей”* (http://news/belta.by/ru/news/archive?date=20_08_2008&page=1&id=260683). Нізкай актыўнасцю апазыцыйных партый сайт тлумачыць і малы адсотак (0,2%) іх прадстаўнікоў у складзе ўчастковых выбарчых камісій (http://news/belta.by/ru/news/archive?date=20_08_2008&page=1&id=260735).

Выступы кандыдатаў у дзяржаўных электронных СМІ не змянілі агульнага характару асвятлення выбарчай кампаніі. Бо трансляваліся не на найбольш рэйтынгавых агульнанацыянальных каналах і да таго ж выходзілі ў эфір у гадзіну “пік” (з 17.30 да 18.30 на тэлеканале “Лад”), калі большасць насельніцтва не магла іх убачыць.

Хоць пазней ЦВК і прыняў рашэнне рэтрансляваць выступы кандыдатаў, што фармальна павялічыла час, адведзены выбарам у дзяржаўных СМІ, застаецца аднак спрэчным, ці дапамагло гэта выбарцам сфармаваць меркаванне адносна кандыдатаў у дэпутаты і іх перадвыбарчых праграм. Паўтор зваротаў кандыдатаў на канале СТВ (з 18.00 да 20.00) шырока не анансаваўся. (Між тым, аб’явы пра магчымасць датэрміновага галасавання рэгулярна рабіліся нават у грамадскім транспарце.) Да таго ж, канал СТВ не ўваходзіць у лік найбольш рэйтынгавых каналаў. Урэшце, рашэнне ЦВК не закранула магчымасці бясплатнага перадруку праграм кандыдатаў у дзяржаўнай прэсе.

Адрозна ад дзяржаўных СМІ, недзяржаўныя газеты і інтэрнет-выданні стварылі значна шырэйшую карціну выбарчай кампаніі і падалі больш інфармацыі не толькі пра палітычныя партыі і кандыдатаў, але і пра іншых суб’ектаў, праігнараваных дзяржаўнымі СМІ. Напрыклад, недзяржаўная газета *“Народная воля”* пісала пра дзейнасць 21 палітычнага суб’екта, а прэзідэнцкая газета *“Советская Белоруссия”* – толькі пра 7. Пераважную большасць сваёй плошчы згаданае незалежнае выданне адвяло апазіцыйным кандыдатам (42% у параўнанні з астатнімі суб’ектамі), у той час як *“Советская Белоруссия”* большасць сваёй плошчы (81%) аддала прэзідэнту. У перыяд з 23 жніўня да 5 верасня незалежны інтэрнет-рэсурс www.naviny.by прысвяціў

26.901 знак сваёй віртуальнай прасторы апазіцыйным кандыдатам, між тым як найбольш уплывовы дзяржаўны інтэрнет-рэсурс www.belta.by адвёў ім усяго 982 знакі, прычым рэпрэзентаваў іх выключна ў адмоўным святле. Разам з тым *"Народная воля"* і www.naviny.by пісалі пра апазіцыйных кандыдатаў не толькі станоўча, але і нейтральна або адмоўна.

Маючы, аднак, надзвычай абмежаваны наклад і адносна невялікі ахоп аўдыторый, незалежныя прэса і інтэрнет-выданні не змаглі змяніць агульную атмасферу адсутнасці палітычнай канкурэнцыі і кампенсаваць хібы дзяржаўных СМІ, каб данесці інфармацыю пра кандыдатаў і іх праграмы.

Дзяржаўныя медыя вельмі станоўча ацэньвалі вынікі выбараў, асабліва падкрэсліваючы, што ніводны кандыдат ад апазіцыі не прайшоў у парламент. Гэтак, у артыкуле "*Правильное направление*", надрукаваным у газеце *"Советская Белоруссия"* 30 верасня 2008 г., гаворыцца: *"Удивляет, разумеется, не то, что люди не хотят менять нынешний курс, а то, что оппозиция не смогла воспользоваться теми возможностями, которые ей были предоставлены на этих выборах. На некоторых этапах избирательной компании могло сложится ощущение, что оппозиционным кандидатам не то что не мешают, как некоторые из них заявляют, а буквально «за уши тащат» в Парламент".*

Дзяржаўныя СМІ салідарна заяўлялі пра адсутнасць усялякіх парушэнняў закона і ў самай катэгарычнай манеры адкідалі ўсе падазрэнні ў фальсіфікацыі ці скажэнні сапраўдных вынікаў выбараў. 4 кастрычніка *"Народная газета"* ў артыкуле *"Эстафету перенять готовы"* пісала: *"Особое внимание ЦИК уделил обеспечению прозрачности последнего этапа кампании – подсчёту голосов, который прошёл открыто, с участием наблюдателей".*

Нарэшце, прэзідэнт краіны заявіў, што выбары былі максімальна празрыстымі і прадэманстравалі дэмакратычнасць сённяшняй сістэмы ўлады ў Беларусі (http://naviny.by/rubrics/politic/2008/10/07/ic_articles_112_159353/).

Недзяржаўная прэса і інтэрнет-выданні, ацэньваючы выбары, звярнулі ўвагу на факты парушэння (і, у прыватнасці, на тое, што назіральнікам не дазвалялі прысутнічаць пры падліку галасоў), а таксама змясцілі шэраг аналітычных матэрыялаў, у якіх разглядаліся далейшыя перспектывы дачыненняў паміж Беларуссю і Еўрасаюзам.

**Высновы**

Дзяржаўныя медыя асвятлялі выбарчую кампанію невыразна, не надаючы ёй належнай увагі. Праз гэта яны звялі да мінімуму палітычную канкурэнцыю паміж рознымі палітычнымі сіламі і тым самым выключылі выбарцаў з палітычнай барацьбы.

Селектыўнае асвятленне выбарчага працэсу падцвярджаецца і тым, што дзяржаўныя СМІ палічылі непатрэбным вылучыць эфірны час і плошчу, каб звычайныя грамадзяне мелі магчымасць абмеркаваць розныя палітычныя платформы і праграмы кандыдатаў, наладзіць дыскусіі і выказаць свае погляды. Між тым, дзяржаўныя медыя атрымліваюць фінансаванне з бюджэту краіны, а таму маюць абавязак перад грамадствам даносіць да выбарцаў поўную і ўсебаковую інфармацыю, уключна з меркаваннямі саміх выбарцаў, як і абавязак сумленна рэпрэзентаваць усіх палітычных канкурэнтаў.

Характар асвятлення выбарчай кампаніі прадэманстраваў, што дзяржаўныя медыя не з'яўляюцца форумам для абмену думкамі, публічных дэбатаў, журналісцкіх

расследаванняў і каментароў, якія паспрыялі б таму, каб выбарцы падчас галасавання маглі абапірацца на аб’ектыўную інфармацыю ды ўзважанае меркаванне датычна прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат. Названыя медыя, па сутнасці, нічым не дапамаглі беларускім грамадзянам зрабіць кампетэнтны і ўсвядомлены выбар.

Рашэнне ЦВК рэтрансляваць выступы кандыдатаў не змяніла агульнага характару асвятлення выбарчай кампаніі ў дзяржаўных СМІ. Кандыдаты ў дэпутаты не фігуравалі ў гэтых медыя ў якасці найбольш важных суб’ектаў выбарчага працэсу.

Ацэнка вынікаў галасавання толькі пацвердзіла заангажаванасць дзяржаўных СМІ у сфармуляваную сённяшнімі ўладамі палітычную і ідэалагічную стратэгію самадастатковасці і самазахавання.

# BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**БЕЛТА**

21.07-27.09.2008

**Адзінка вымярэння - колькасць знакаў**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

## BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**Белорусы и рынок**

21.07-27.09.2008

**Адзінка вымярэння - см. кв.**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

**BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008**

**Брестский курьер**

20.09-27.09.2008

**Адзінка вымярэння - см. кв.**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

## BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**Першы нацыянальны канал, Панорама недели**

21.07-27.09.2008

**Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

**BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008**

**Першы нацыянальны канал, Панорама недели**

21.07-27.09.2008

**Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)**




PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

## BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**“Днепровская Неделя”**

20.09-27.09.2008

**Адзінка вымярэння - см. кв.**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

**BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008**

**Euroradio**

20.09-27.09.2008

**Адзінка вымярэння - колькасць знакаў**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

## BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**Гомельскае абласное радыё 101.3 FM**

21.07-27.09.2008

**Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

**BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008**

**Гомельскае абласное радыё 101.3 FM**

21.07-27.09.2008

**Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)**




PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

# BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**Гомельская праўда**

21.07-27.09.2008

**Адзінка вымярэння - см. кв.**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

**BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008**

**Комсомольская правда в Белоруссии**

21.07-27.09.2008

**Адзінка вымярэння - см. кв.**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

**BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008**

**ТРК "Магілёў" / "Навіны"**

21.07-27.09.2008

**Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

**BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008**

**ТРК “Магілёў” / ”Навіны”**

21.07-27.09.2008

**Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)**




PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

## BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**ТРК “Магілёў” / ”Новости-Регион”**

21.07-27.09.2008

**Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

**BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008**

**ТРК “Магілёў” / ”Новости-Регион”**

21.07-27.09.2008

**Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)**




PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

# BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**“Могилёвская Правда”**

21.07-28.09.2008

**Адзінка вымярэння - см. кв.**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

# BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**Народная воля**
21.07-27.09.08

**Адзінка вымярэння - см. кв.**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

# BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**NAVINY.BY**

21.07-27.09.2008

**Адзінка вымярэння - колькасць знакаў**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

**BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008**

**Агульнанацыянальнае тэлебачанне (ОНТ)**

21.07-27.09.2008

**Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

**Агульнанацыянальнае тэлебачанне (ОНТ)**

21.07-27.09.2008

**Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)**




PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

## BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**Першы канал беларускага радыё, «Радыёфакт»**
21.07-27.09.2008

**Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**Першы канал беларускага радыё, «Радыёфакт»**

21.07-27.09.2008

**Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)**




PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

## BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**Рэспубліка**

21.07-27.09.2008

**Адзінка вымярэння - см. кв.**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

## BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**“Советская Белоруссия: Беларусь сегодня”**

21.07-27.09.2008

**Адзінка вымярэння - см. кв.**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

**BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008**

**TUT.BY**

21.07-27.09.2008

**Адзінка вымярэння - колькасць знакаў**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

**BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008**

**“Навіны рэгіёна” (Гомель), Першы нацыянальны канал**

21.07-27.09.2008

**Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)**







PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com

BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**“Навіны рэгіёна” (Гомель), Першы нацыянальны канал**

21.07-27.09.2008

**Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)**




PDF created with pdfFactory trial version www.pdffactory.com